Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 КРАСАВІКА 2014 г. СЕРАДА № 80 (27690) Кошт 1600 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ТРОЙЧЫ ВЫВЕРАНАЯ ПАЗІЦЫЯ

Непераадольных перашкод для стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза не існуе

Фота БЕЛТА.

Сустрэчу прэзідэнтаў Беларусі, Казахстана і Расіі, якая ўчора адбылася ў Мінску, можна без перабольшвання назваць ключавой у рабоце над праектам дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Адкрываючы пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў у вузкім складзе, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб тым, што ў свой час экспертам даручалася падрыхтаваць праект дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, і калі ўзнікнуць непераадольныя перашкоды і спатрэбіцца ўдзел прэзідэнтаў, то лідары трох краін гатовыя сабрацца ў любы час.

СТАР. 2

Яркі дзень Першамая

Паважаныя суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас са Святам працы.

Першамай, які ўвайшоў у наша жыццё больш як стагоддзе таму, стаў сімвалам сацыяльнай справядлівасці і глыбокай павагі да працоўнага чалавека.

Беларускі народ заўсёды імкнуўся да мірнай стваральнай працы. І сёння патрыятызм і з'яднанасць нашага грамадства пацвярджаюцца карпатлівай і напружанай работай, ад якой залежыць дабрабыт суверэннай Беларусі. Кожны з нас, праяўляючы прафесіяналізм, ініцыятыву і талент, уносіць свой уклад у дзяржаўнае будаўніцтва.

У гэты дзень мы выказваем шчырую ўдзячнасць ветэранам працы, чыімі рукамі ствараўся нацыянальны здабытак Рэспублікі Беларусь, і ўшаноўваем маладую змену працаўнікоў, якія прымнажаюць гэта багацце, умацоўваюць слаўныя традыцыі нашых продкаў.

Жадаю вам здароўя, шчасця і прафесійных поспехаў.

Няхай яркі дзень Першамая падорыць вам упэўненасць у будучыні, бадзёры настрой, натхніць на дасягненне новых перамог.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Каго «Містары Беларусь» сустракалі стоячы

СТАР. 5

Лепшы дзіцячы ліст пра музыку

СТАР. 7



Убачыць беларускі авангард — дзе і за які кошт

СТАР. 8

ISSN 1990 - 763X

■ Педсавет

ФІЗІКА І ХІМІЯ: ЯК ІХ ПАЛЮБІЦЬ

Ёсць прадметы, якія не могуць выкладацца ў школе толькі на тэарэтычным узроўні

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Нечаканую прапанову — зрабіць адзіны дзяржаўны экзамен па фізіцы і хіміі абавязковым для ўсіх выпускнікоў расійскіх школ — агучыла на «круглым стале», прысвечаным перспектывам развіцця інжынернай справы ў Расіі, спікер Савета Федэрацыі Валянціна Матвіенка.

Як вядома, у Расіі адзіны дзяржэкзамен з'яўляецца адначасова выпускным экзаменам за курс сярэдняй школы і ўступным экзаменам у ВНУ. Два прадметы — руская мова і матэматыка — абавязковыя для ўсіх выпускнікоў. Іншыя дысцыпліны, якія спатрэбяцца ім для паступлення, старшакласнікі выбіраюць сабе самастойна. Але з 2009 года здача АДЭ па матэматыцы і рускай мове на станоўчую адзнаку — адзіны спосаб закончыць расійскую школу. Не здаў экзамен — атэстат не атрымаеш.

Размова на «круглым стале» ішла пра дэфіцыт у краіне спецыялістаў з вышэйшай тэхнічнай адукацыяй. На думку Валянціны Матвіенкі, часта выпускнікі і іх бацькі ідуць больш лёгкім шляхам, выбіраючы экзамены па гуманітарных прадметах. Здаваць гуманітарныя прадметы, безумоўна, «добра і цудоўна», але гэта абмяжоўвае магчымасці выпускнікоў пры паступленні ў тэхнічныя і інжынерныя ВНУ.

— Паколькі сёння востра стаіць праблема падняцця прэстыжу прафесіі, можа быць, трэба ўвесці ў абавязковыя экзамены фізіку і хімію? — запрасіла падумаць над сваёй прапановай Валянціна Матвіенка.

СТАР. 4

■ Балючая тэма

З ЖЫЦЦЯ МАТАЦЫКЛІСТАЎ

Як даць ім рады, калі яны паводзяць сябе на дарогах па-хамску

Цішыню вясновага вечара раптам парушае рэзкі гук. Праз лічаныя секунды па дарозе з хуткасцю кулі пралятае матацыкліст і знікае за паваротам. Гэтая карцінка становіцца ўсё больш звыклай на сталічных дарогах.

«Байкеры — гэта стыль жыцця. Іх нельга блытаць з мотахуліганамі»

На вуліцах Мінска ўсё часцей равуць рухавікі двухколавых коней, якія перашкаджаюць людзям спакойна спаць. І людзі пачынаюць матацыклістаў ненавідзець. Так і ствараецца яшчэ адзін грамадскі канфлікт.

— У параўнанні з мінулым годам колькасць ДТЗ з удзелам матацыклістаў павялічылася ў дзевяць разоў — з 3 да 28, — канстатуе **Генеральны пракурор Аляксандр КАНЮК.** Сямёра матацыклістаў ужо загінулі, хоць летась на пачатку сезона не было ніводнага смяротнага выпадку. І гэтую праблему нельга заганяць у кут. Бо паміж аўтамабілістамі і матацыклістамі пачынаюць узнікаць сур'ёзныя рознагалоссі. У аб'ектывы відэарэгістратараў усё часцей пачынаюць трапляць бойкі на праезнай частцы, пасярод плыні...

І яшчэ адна адметнасць — тое, што мотахуліганы пачалі перашкаджаць людзям. Пры гэтым будзе грубай памылкай блытаць іх з байкерамі, як гэта адбываецца сёння ў беларускім грамадстве. Байкер у маім разуменні — гэта стыль жыцця. Гэта сур'ёзныя, дысцыплінаваныя людзі, яны ездзяць на дарагіх якасных матацыклах, у іх надзейная экіпіроўка. І таму праблем менавіта з байкерамі ў нас няма.

— У любой людской супольнасці ёсць індывідуумы, якія імкнуцца вылучыцца з агульнай масы і тым самым псуюць агульнае ўражанне, — запэўнівае **кіраўнік мотаклуба Racing Clan, вядомы беларускі байкер Зміцер СЦЕПАНЕНКА.** — І, па маіх назіраннях, гэта датычыцца любога кола. Ды вось менавіта па такіх людзях, якія выклікаюць толькі негатыўную рэакцыю, пачынаюць меркаваць аб усіх астатніх. Я маю зараз на ўвазе менавіта маладых хуліганаў на матацыклах. А цень абвінавачвання кладзецца на ўсіх. І вельмі крыўдна чуць размовы за спінай і ўвесь той негатыў на свой адрас, якога мы, байкеры, шчыра кажучы, не заслужылі.

СТАР. 3

ТРОЙЧЫ ВЫВЕРАНАЯ ПАЗІЦЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Непераадольных перашкод, як прызналі ў выніку ўдзельнікі сустрэчы, на шляху стварэння саюза не існуе, а вось спрэчныя пытанні сапраўды запатрабавалі абмеркавання на самым высокім узроўні.

Да таго, як гаварыць пра надзённыя праблемы ў вузкім коле, а затым прыступіць да працы ў пашыраным складзе з удзелам спецыялістаў і абмеркаваць канкрэтныя пытанні і існуючыя перашкоды, кіраўнікі трох дзяржаў амаль дзве гадзіны размаўлялі ў нефармальнай абстаноўцы.

На пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў у вузкім складзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў: калі бакі не гатовыя рэалізаваць дамоўленасці, аб Еўразійскім эканамічным саюзе трэба гаварыць гадоў праз дзесяць. «Да падпісання дагавора застаецца зусім мала часу. Узнікае пытанне: з чым мы прыйдзем да саюза?» — сказаў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем заўважыў, што сёння ўжо сфарміраваўся круг пытанняў, па якім погляды бакоў разыходзяцца, і пералік гэтых пытанняў насцярожвае. «Таму мы і сабраліся, каб іх зняць, вырашыць», — сказаў ён.

«Нам прапаноўваюць сёння пакінуць нявырашанымі тыя праблемы, якія трэба было б вырашыць яшчэ на папярэдніх этапах. Па нашым цвёрдым перакананні, мы павінны выходзіць на канкрэтныя рубяжы, адным з якіх з'яўляецца паўнафарматны Мытны саюз. Паміж яго членамі не павінна быць ніякіх абмежаванняў у руху тавараў, якімі б адчувальнымі яны ні былі», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. На яго думку, доўгатэрміновае захаванне любых формаў абмежаванняў у руху тавараў, тым больш такіх, як энерганосьбіты, стварае непажаданы прэцэдэнт.

«Падыходы, якія заяўляюцца ў працэсе перамоў, выклікаюць шмат пытанняў. Наватарскія прапановы па тэрмінах рэалізацыі дамоўленасцяў праз 10 гадоў, гэта значыць да 2025 года, прынамсі гучаць дзіўна. Калі мы не гатовыя прымаць меры цяпер, то гэта трэба адкрыта прызнаць», — агучыў сваю думку кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею на тое, што адбудзецца зацікаўленая размова і па іншых тэмах, якія тычацца АЭП і будучага Еўразійскага эканамічнага саюза. Прэзідэнт адзначыў, што ёсць пытанні па аўтамабільных грузаперавозках з трэціх краін. «Хіба гэта не абсурдна, што выгаду ад інтэграцыі нашых краін атрымаюць, дапусцім, польскія, літоўскія або іншыя грузаперавозчыкі?» — заўважыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ён таксама дадаў, што ад таго, наколькі эфектыўным будзе саюз, залежыць яго прывабнасць для іншых краін. «Але і сам саюз павінен набываць большае напаўненне ад свайго пашырэння», — сказаў беларускі лідар.

Не варта ператвараць інтэграцыю Беларусі, Казахстана і Расіі ў працэс дзеля працэсу, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка: «Нас ніхто не штурхае ў спіну, усе графікі мы вызначаем самі, але мне здаецца, ператвараць у працэс дзеля працэсу па прынцыпе: важны не вынік, а удзел — думаю, нам гэта не трэба».

«1 студзеня 2015 года мы павінны будзем адказаць на пытанні нашых грамадзян: куды мы прыйшлі, што ў выніку атрымалі нашы дзяржавы. Адказы ў нас павінны быць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Без шчырай, я б сказаў, мужчынскай размовы сёння не абысціся. У Беларусі ёсць сваё бачанне цяперашняй сітуацыі, і мы гатовыя адкрыта, па-партнёрску пра гэта гаварыць», — сказаў Прэзідэнт. «Хацелася б, каб вы, паважаныя мае сябры, пакідаючы Мінск, былі ў добрым настроі. Гэта будзе залежаць ад тых рашэнняў, якія мы з вамі прымем», — дадаў беларускі лідар.

Сёння ёсць шэраг яшчэ не вырашаных пытанняў па стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза, але іх можна дадаткова прапрацаваць і знайсці кампрамісы, адзначыў у ходзе пасяджэння Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. Ён канстатаваў, што праведзена вялікая праца па стварэнні «самага развітага на постсавецкай прасторы інтэграцыйнага аб'яднання». Паводле яго слоў, Мытны саюз, які стварылі Беларусь, Расія і Казахстан, працуе і прыносіць рэальную карысць. «І гэта мы бачым на выніках эканомікі нашых краін. Тут жа гэта абсалютна відавочны факт», — падкрэсліў ён.

«Але мы можам зрабіць яшчэ адзін крок (мы дамаўляліся пра гэта), крок па паглыбленні нашага ўзаемадзеяння, прасунуць наша супрацоўніцтва на больш высокі ўзровень», — лічыць Прэзідэнт Расіі. Ён адзначыў, што за апошні час праведзена вялікая праца на экспертным урадавым узроўні па падрыхтоўцы праекта дагавора аб стварэнні ЕАЭС. Падрыхтаваны грунтоўны дакумент на 600 старонак. «Але справа нават не ў тым, колькі там старонак. Справа ў тым, што па змесце гэта дакумент, які дае нам магчымасць зрабіць яшчэ адзін крок у паглыбленні нашага ўзаемадзеяння. Сапраўды, мы можам якасна змяніць наша супрацоўніцтва. Гэта дазволіць нам выйсці на павышэнне канкурэнтаздольнасці эканомік, зрабіць іх больш эфектыўнымі, прыцягваць унутраныя і знешнія інвестыцыі. І гэты вялізны рынак у 170 млн чалавек, які мы з вамі стварылі, можа набыць зусім новую якасць, дадаткова набыць прывабнасць і стаць больш эфектыўным і змястоўным», — сказаў Уладзімір Пуцін.

Разам з тым Прэзідэнт Расіі прызнаў, што ёсць некаторыя пытанні, якія «на экспертным узроўні не цалкам яшчэ дапрацаваны». Іх рашэнне застаецца за кіраўнікамі дзяржаў.

Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў таксама лічыць пераадольнымі рознагалоссі, якія маюцца на шляху стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза. «Я за тое, каб коней не гнаць, але ёсць магчымасць укласціся ў прынятыя тэрміны і зняць усе пытанні. Мы можам дамовіцца», — перакананы Нурсултан Назарбаеў.

«Мы выходзім на прамую лінію падпісання дагавора, і я падтрымліваю тое, што цяпер сказаў Аляксандр Лукашэнка, — вялікую частку шляху мы прайшлі», — адзначыў Прэзідэнт Казахстана. Паводле яго слоў, напярэдадні эксперты добра папрацавалі, і да саюза, які ствараецца, ужо праяўляюць цікавасць іншыя партнёры.

Як падкрэсліў Нурсултан Назарбаеў, на сустрэчы «тройкі» трэба будзе падрабязна абмеркаваць усе пытанні, у тым ліку рознагалоссі па праекце дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. «Сёння ўвага грамадскасці як унутры краін, так і за мяжой прыкавана да гэтага, — сказаў Нурсултан Назарбаеў. — Трэба старанна паглядзець і выканаць усе прававыя аспекты, інтарэсы нашых дзяржаў».

Паводле слоў Прэзідэнта Казахстана, праведзена немалая праца па найбольш вострых пытаннях, прадугледжаных у пераходныя перыяды. «Усе гэтыя пытанні мы абмяркоўвалі, ствараючы Мытны саюз і пры фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы. Думаю, нашы эксперты з камісіі працавалі і паставілі нам пытанні, па якіх яны не дамовіліся, і мы па-таварыску, як заўсёды, абмяркуем кожны пункт і будзем вырашаць, што нам рабіць», — сказаў Нурсултан Назарбаеў.

Казахстанскі лідар выказаў упэўненасць, што ўдасца знайсці кансэнсус па ўсіх наяўных пытаннях і ў выніку дамовіцца, прыняць пэўныя рашэнні.

На пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ў пашыраным складзе абмяркоўваліся ўжо канкрэтныя пытанні, якія неабходна вырашыць у ходзе стварэння ЕАЭС. У прыватнасці, старшыня Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Віктар Хрысценка паведаміў, што ў саюзе прапануецца адзіная канструкцыя для рынкаў нафты, нафтапрадуктаў і газу. Старшыня Калегіі ЕЭК, інфармуючы ўдзельнікаў пасяджэння аб ходзе работы над праектам дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, адзначыў, што напярэдадні саміту «тройкі» адбылося пасяджэнне Савета ЕЭК. «Некаторыя рэчы ўдакладнены. Хоць трэба сказаць, што некаторыя пытанні з'явіліся новыя. З'явіліся яны таму, што былі дадзены даручэнні міністэрствам шэраг пытанняў прапрацаваць, але, на жаль, некаторыя з іх засталіся неўрэгуляванымі, таму па рашэнні савета мы вынеслі гэта на ваш суд, на ваша абмеркаванне», — заявіў Віктар Хрысценка.

Акрамя таго, старшыня Калегіі ЕЭК далажыў удзельнікам пасяджэння аб ходзе работы па рэалізацыі дарожнай карты па далучэнні Арменіі да Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Казахстана і Расіі.

Па выніках пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ў пашыраным складзе Віктар Хрысценка заявіў, што ўсе рознагалоссі па праекту дагавора аб ЕАЭС урэгуляваныя.

Паводле БЕЛТА.

АДЛЕГЛАСЦЬ — НЕ ПЕРАШКОДА

Канферэнцыя, прысвечаная садзейнічанню гандлю, інвестыцыям, працоўнаму ўзаемадзеянню і развіццю турызму адбылася ў Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Беларусь і В'етнам прадстаўлялі дыпламаты, спецыялісты сферы гандлю і турызму, знаўцы пытанняў грамадзянства і міграцыі, супрацоўнікі Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва.

Генеральны дырэктар холдынга «БелГАЗаўтасэрвіс» Міхаіл Супруновіч і генеральны дырэктар гандлёва-турыстычнай фірмы «Era Group» Фам Суан Ньят аглядаюць новабудоўлю ў Мінску.

Адлегласць, большая за восем тысяч кіламетраў, не перашкаджае плённаму супрацоўніцтву Беларусі і В'етнама. Такая выснова гучала ў выступленнях усіх удзельнікаў канферэнцыі, якія да таго ж дзяліліся сваімі думкамі, як зрабіць сувязі краін яшчэ больш плённымі. Было адзначана, што актыўнаму развіццю палітычнага дыялога спрыяе пашырэнне супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай і іншых галінах.

Асноўнымі таварамі беларускага экспарту ў далёкую краіну з'яўляюцца калійныя ўгнаенні, трактары, шыны, грузавыя аўтамабілі. В'етнам дасылае беларускім спажыўцам мора-прадукты, агародніну і кансерваваную садавіну, трыкатажныя вырабы, натуральны каўчук.

Было адзначана, што сёлета спаўняецца дзесяць гадоў з таго дня, калі Беларуская гандлёва-прамысловая палата падпісала пагадненне аб супрацоўніцтве з Гандлёва-прамысловай палатай В'етнама.

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.

З прадстаўнікамі В'етнама гутарыць удзельнік канферэнцыі, генеральны дырэктар будаўнічага трэста №13 Анатоль Бокій. Яго арганізацыя зацікаўлена ў развіцці працоўнай міграцыі з в'етнамскага боку.

Аўтамабіль высокай праходнасці, распрацаваны на «БелГАЗаўтасэрвісе», быў прадэманстраваны ўдзельнікам канферэнцыі ва ўмовах бездарожжа. Зацікаўленыя спецыялісты высока адзначылі якасць такога ўсюдыхода.

■ Спорт-тайм

НАЙЛЕПШЫ СЕЗОН ТАЦЦЯНЫ ДРАЗДОЎСКАЙ

У традыцыйным спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра спартыўныя перыпетыі апошніх дзён.

1. Мінскае «Дынама» атрымала чацвёртую перамогу ў сезоне і замацавала лідарства ў чэмпіянаце краіны. У матчы супраць «Гомеля» вылучыліся легіянеры — у вароты зялёна-белых забівалі Эрнан Фігерэда і Ненад Адамавіч (2:0). Барысаўчане разгромілі брэсцкае «Дынама» — 4:0. Героем матча стаў Сяргей Крывец, які адзначыўся хет-трыкам і галявой перадачай. Дзякуючы гэтаму Крывец апярэдзіў гульца «Белшыны» Мануэля Бледу ў бамбардзірскай гонцы.

Упэўненае выступленне працягвае «Нафтан» (перамога над «Мінскам» — 1:0), які абыходзіцца без паражэнняў пяты матч запар. Гэта, між іншым, рэкорд наваполацкага клуба на старце сезона! Слуцк дабіўся другой перамогі ў сезоне, перайграўшы ў гасцях «Белшыне» — 2:1. Адзначым, што падчас матча за размовы з арбітрам быў выдалены настаўнік навічкоў вышэйшай лігі Юрый Крот. Безгалявой нічыёй скончыліся паядынкі «Нёман» — «Тарпеда-БелАз» і «Шахцёр»—«Дняпро».

2. Зборная Беларусі па хакеі пераможна скончыла спарынгі супраць датчан. У першым матчы беларусы саступілі гаспадарам пляцоўкі — 4:5. Але ў наступнай сустрэчы падапечныя Глена Хэнлана ўзялі рэванш, атрымаўшы валявую перамогу — 4:3. Дублем вылучыўся Андрэй Стась. Адзначым, што ў другім паядынку з-за праблем са спінай на лёд не выйшаў адзін з лідараў нашай каманды Аляксей Калюжны.

3. За тур да фінішу сезона **стаў вядомы пераможца чэмпіянату Беларусі па валейболе.** Мінскі «Будаўнік», упэўнена перайграўшы «Шахцёр» — 3:0, забяспечыў сабе перамогу ў першынстве краіны.

4. Беларуская яхтсменка Таццяна Драздоўская заняла другое месца на заключным этапе Кубка свету ў французскім Ерэ. На гонку наша спартсменка ішла лідарам, аднак на апошнім этапе прапусціла наперад бельгійку Эві ван Акер. Тым не менш, Таццяна Драздоўская стала лепшай у медальным заліку сёлетняга сезона ў класе Лазер Радыял. На пяці этапах Кубка свету беларуска заваявала адно «золата» і два сярэбраныя медалі.

5. Мінск можа прыняць чэмпіянат Еўропы па футболе ў 2020 годзе. Беларуская федэрацыя футбола падала заяўку на ўдзел у правядзенні фінальнага этапа чэмпіянату Еўропы-2020. У верасні УЕФА абвесціць спіс 13 гарадоў, у якіх пройдуць матчы кантынентальнага першынства 2020 года. Сярод іншых прэтэндэнтаў — Амстэрдам, Афіны, Базель, Берлін, Брюсель, Заграб, Лісабон, Лондан, Мадрыд, Масква, Парыж, Рым, Стамбул.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

УЗДОЎЖ РАКІ ПАМЯЦІ

Радаўніца ў адселенай чарнобыльскай зоне пачынаецца з кантрольна-прапускных пунктаў. У Нараўлянскім раёне былыя жыхары выселеных вёсак перасякаюць КПП «Цешкаў» і кіруюць у бок беларуска-ўкраінскага памежжа ўздоўж ракі Прыпяць. Карпавічы, Дзёрнавічы, Надтачаеўка, Вепры, Бярозаўка, Вяжышча, Данілееўка... Яны могуць сустрэцца на радзіме толькі ў гэты дзень.

У былой вёсцы Ражава на Радаўніцу заўсёды людна. Толькі палова на дзявятую раніцы, а на дарозе, якая ідзе ўздоўж могілак, і машынна, і людна. Поціскі рук, абдымкі, пацалункі — былыя жыхары не бачыліся болей за год, а многія не сустракаліся нават дзесяцігоддзямі. Колішнія паселішчы Даўляды і Белая Сарока на самай мяжы з Украінай. Каля могілак тут шмат аўто з украінскімі нумарамі. Але 28 гадоў з дня чарнобыльскай катастрофы людзей не раз'ядналі. Узгадваючы сваіх спачылых родных, яны садзяцца за агульныя сталы, частуюцца, распытваюць адно аднаго пра здароўе і справы.

Чарнобыльская Радаўніца імгненная. Не паспелі людзі прывітацца, прыбраць магілы і прысесці за сталы, як час развітвацца. Зноў на год, на дзесяцігоддзі. Да наступнай сустрэчы, якая абавязкова адбудзецца.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Нараўлянскі раён.

■ Прыемная навіна

Прыгажосць і творчасць пад адным дахам

У горадзе Узда адкрыўся новы Палац культуры. Ён узводзіўся па індывідуальным праекце. І трэба сказаць, атрымаўся непаўторным, незвычайным па архітэктуры. А самае галоўнае, бадай, тое, што сабраў пад адным дахам мастацтва, творчасць, прыгажосць.

Да гэтага ўстанова месцілася ў будынку касцёла Узвышэння Святога Крыжа, помніка архітэктуры XVIII стагоддзя. Тут туліліся шматлікія дзіцячыя і дарослыя творчыя аматарскія калектывы, праводзіліся дыскатэкі.

Як адзначыў **старшыня райвыканкама Вячаслаў ПАХОЛЬЧЫК,** горад меў вострую патрэбу ва ўстанове такога тыпу. Будаўніцтва працягвалася два гады за кошт сродкаў абласнога бюджэту. Пры ўзвядзенні і аснашчэнні аб'екта на 85% выкарыстаны матэрыялы, мэбля і абсталяванне айчынных вытворцаў. «Новы Палац культуры — толькі частка плана па развіцці і добраўпарадкаванні Узды, — адзначыў Вячаслаў Вячаслававіч. — Ужо распрацавана каштарысна-праектная дакументацыя на будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу з плавальным басейнам.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

З ЖЫЦЦЯ МАТАЦЫКЛІСТАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Байкеры таксама прапаноўваюць рэфармаваць сістэму падрыхтоўкі матацыклістаў у больш жорсткім кірунку. Гэтага погляду яны прытрымліваюцца з той мэтай, каб на дарогах стала менш безадказных людзей.

— Трэба кардынальна змяніць падыход у навучанні для атрымання правоў катэгорыі А, — лічыць **Аляксандр ТАРАСАЎ, кіраўнік мотаклуба LIVE TO RAID MCC Belarus.** — Таму што вялікую праблему ствараюць матацыклісты, якія не маюць вадзіцельскага пасведчання. Пры патрабаванні супрацоўнікаў ДАІ спыніцца яны, як правіла, пачынаюць уцякаць, пры гэтым чхаюць на бяспеку іншых удзельнікаў руху... Мы выступаем за тое, каб павялічыць колькасць моташкол, перагледзець там тэхнічную базу. Усё-такі матацыклы мінскай вытворчасці — гэта не тое, што ў большасці сваёй ездзіць па нашых дарогах.

Ці трэба канфіскоўваць матацыклы?

Летась упершыню з 1968 года Беларусь пераадолела ў бок паніжэння сімвалічную планку ў тысячу загінулых на дарогах. Аднак штодзённа на дарогах гінуць два-тры чалавекі, а 14 атрымліваюць траўмы. За гэтымі лічбамі стаяць смерці блізкіх і родных, велізарныя выдаткі на лячэнне раненняў, судовыя прыгаворы...

«Шмат бяспекі на дарогах не бывае».

— Зараз у краіне зарэгістравана больш за 3 мільёны 600 тысяч транспартных сродкаў. Гэта прыкладна 400 адзінак на тысячу жыхароў, — прыводзіць лічбы **міністр унутраных спраў Беларусі Ігар ШУНЕВІЧ.** — За 10 гадоў на нашых дарогах загінулі 14 тысяч чалавек, а яшчэ 65 тысяч атрымалі траўмы. Той гадавы ўрон, які прыносяць дарожна-транспартныя здарэнні, ацэньваецца прыкладна ў 2-3% ад валавога ўнутранага прадукту. Гэта сярэдні сусветны паказчык, прыдатны і да Беларусі.

Кожнае восьмае парушэнне правіл дарожнага руху звязана з перавышэннем хуткасці, кожнае дзясятае — з грэбаваннем рамянямі бяспекі ці моташлемамі. Што адметна, ва ўзросце да 25 гадоў людзі трапляюць у ДТЗ удвая часцей, чым старэйшыя.

— Тут справа больш датычыцца асабістай культуры як кіроўцы, так і пасажыра, — працягвае Ігар Шуневіч. — Калі вадзіцель перавышае хуткасць, свядома парушае правы грамадзян на адпачынак уначы, не прапускае пешаходаў на пераходах, — глыбока ўпэўнены, што такому чалавеку ўласціва агрэсіўнасць. У яго прэваліруе эгаізм, які рана ці позна, але выльецца ў трагедыю. Ды і так ён свядома становіцца патэнцыяльным злачынцам.

Шмат бяспекі на дарогах не бывае. Мы бачым рэальныя станоўчыя вынікі пасля ўвядзення канфіскацыі за паўторную язду ў нецвярозым стане. Укараненне фотафіксацыі зменшыла на некаторых участках траўматызм і смяротнасць на чвэрць. І таму адно з выйсцяў, якое бачыцца мне — гэта заканадаўчае расшырэнне магчымасцяў канчатковай або часовай канфіскацыі аўта- ці мотатранспарту ў злосных парушальнікаў. Гэта робіцца для таго, каб ратаваць жыцці людзей...

Паводле слоў **старшыні Следчага камітэта Валянціна ШАЕВА,** аварыі з удзелам матацыклістаў-«хуткаснікаў» даволі часта разгортваюцца па наступным сцэнарыі. Удзельнікі дарожнага руху, разлічваючы на тое, што іншыя кіроўцы на дарозе таксама прытрымліваюцца правіл, часта проста не здольны ацаніць хуткасць матацыкла на далёкай адлегласці, які імчыцца, як куля; не могуць прадугадаць момант манеўра. Хоць матацыкл і мае перавагу, але на велізарнай хуткасці двухколавага каня кіроўца аўтамабіля проста не паспявае пралічыць, што ён стварае для яго перашкоду.

Як слуп мотахуліганам аказаўся

— Нядаўна я ехаў па праспекце Незалежнасці ў Мінску і здзівіўся: што гэта на крайняй левай паласе за слуп такі рэзка ўзнік? — згадвае **дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзім ІПАТАЎ.** — Ды вось, толькі калі пад'ехаў бліжэй, аказалася, што гэта зусім не слуп. Гэта быў матацыкліст, які імчаўся на заднім коле насустрач па раздзяляльнай паласе. І я зніякавеў. А калі б гэты «сюрпрыз» камусьці прыляцеў пад кола, што тады? Гэта яскравы прыклад таго, што з хамствам на дарозе рызыкуе сутыкнуцца кожны кіроўца. І менавіта таму пытанне гэта злабадзённае. Але як яго вырашаць? Між іншым, што датычыцца шуму, які стварае транспартны сродак, у нашым заканадаўстве існуе прабел. А вось у расійскіх правілах дарожнага руху дакладна напісана, што парушэнне гукавога парога — гэта тэхнічная няспраўнасць.

«Ёсць шэраг матацыклаў, якія ўвогуле не павінны праходзіць тэхагляд»

Калі матацыкл укамплектаваны і кіруецца правільна, ён нікому не нашкодзіць. Але калі водзіць яго чалавек легкадумны, то двухколавая машына можа нарабіць непапраўнай бяды. І чаму гэтыя людзі носяцца ўначы? Удзень на сталічных вуліцах транспартныя плыні, як правіла, вельмі шчыльныя. Даводзіцца лавіраваць між аўтамабілямі, і таму разагнацца амаль немагчыма. А ноччу вуліцы вольныя...

— Мы, як матацыклісты, бачым гэтую праблему знутры, — працягвае Зміцер Сцепаненка. — Найперш хацелася б закрануць праблему гуку ад глушыцеляў па начах. Так, у асноўным гэта датычыцца спартыўных матацыклаў. Ёсць і іншыя машыны, якія на нізкай хуткасці таксама ўтвараюць басавіты гук, але не настолькі моцны. Але ёсць і шэраг матацыклаў, якія ўвогуле не павінны праходзіць тэхагляд. У першую чаргу гэта датычыцца старых машын, у якіх глушыцелі адсутнічаюць увогуле або ставяцца саматугам у гаражных умовах. Іншы аспект — гэта глушыцелі ад афіцыйных вытворцаў. Як правіла, яны каштуюць нятанна, але і гучна раўці пачынаюць толькі на максімальных абаротах. А гэта значыць, што хуткасць для гэтага павінна быць шалёнай. Што аўтаматычна азначае парушэнне правілаў дарожнага руху.

Спартыўныя матацыклы правакуюць людзей. І забараняць гэтую тэхніку было б памылковым крокам. Значыць, трэба шукаць альтэрнатыву. Напрыклад, стварыць пляцоўку, дзе б гэтыя людзі змаглі выплюхнуць страсць. Вось, напрыклад, узяць палігон Акадэміі навук у Ліпках. Ён знаходзіцца пасярод лесу, людзям гукі не перашкаджаюць, і аўто там не ездзяць.

— Рэгулярныя трэніроўкі для ўсіх ахвотных праходзяць у Баравой. Ды вось толькі зусім нядаўна з'явілася інфармацыя аб тым, што картадром там пойдзе пад знос, — абураецца Зміцер Сцепаненка. Калі гэта адбудзецца, то мы страцім апошні аскепак таго, што здолелі захаваць, каб чалавек вучыўся ездзіць не па праспектах, а па спецыяльнай трасе...

Трэба перагледзець і сістэму падрыхтоўкі кіроўцаў матацыклаў. І тут вельмі спатрэбяцца напрацоўкі ў краінах замежжа, якія прайшлі праз гэта раней. Так, у Італіі і Германіі чалавек садзіцца на матацыкл, за ім ззаду едзе інструктар з гарнітурай і сочыць за тым, як будучы кіроўца паводзіць сябе ў горадзе.

— А вось у Фінляндыі транспартны сродак, які гучна шуміць, увогуле не дапускаецца да выезду на дарогу, — гаворыць **намеснік дырэктара навукова-практычнага цэнтра праблем умацавання законнасці і правапарадку Генеральнай пракуратуры Аляксандр ГУЧОК.**

Акрамя таго, забароненай зонай для некаторых відаў транспартных сродкаў можа стаць сталічны праспект Незалежнасці. Заканадаўчую норму можна стварыць любую, але яна павінна працаваць. І таму галоўным прынцыпам павінна стаць немінучасць пакарання для хамаў на дарогах...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Фота БЕЛТА.

НА БЯСПЕЦЫ НЕ ЭКАНОМЯЦЬ

Плануецца, што структура падрыхтоўкі беларускіх атамшчыкаў будзе створана налета ў лістападзе, а ў 2016-м пачнецца навучанне спецыялістаў

Атамная электрастанцыя ў Беларусі будуецца. Няхай на яе пляцоўцы пакуль выканана толькі каля 5% работ, але нам ужо цяпер важна ўсвядоміць, на якім узроўні ажыццяўляецца гэтая грандыёзная будоўля, а таксама тое — хто і як будзе нашу станцыю абслугоўваць. Менавіта гэтай тэматыцы быў прысвечаны прэс-тур Мінэнерга на Астравецкую пляцоўку. Падчас яго журналісты наведалі міжнародны семінар «Абмен перадавым вопытам пуску АЭС», у якім прынялі ўдзел буйныя эксперты краін Еўропы і Амерыкі. БелАЭС і Маскоўскі цэнтр Сусветнай асацыяцыі арганізацый (САА), якія эксплуатуюць АЭС, запрасілі на семінар не толькі кіраўнікоў спецыялізаваных арганізацый нашых дзвюх краін, але і спецыялістаў з Украіны, Францыі, Італіі, Славакіі, Ірана і ЗША.

САМЫ СУЧАСНЫ ПРАЕКТ

Беларуская АЭС будзе складацца з двух энергаблокаў сумарнай магутнасцю да 2400 (2х1200) МВт. Для яе будаўніцтва выбраны самы сучасны ў свеце праект «АЭС-2006», які цалкам адпавядае міжнародным нормам і рэкамендацыям МАГАТЭ. **Саветнік Маскоўскага цэнтра САА, якія эксплуатуюць АЭС, Уладзімір БРОННІКАЎ** паведаміў журналістам, што ўдзельнікі семінара дасканала азнаёміліся з тым, як беларусы ўзводзяць станцыю. Усе эксперты пераканаліся ў тым, што будаўнічая пляцоўка мае не толькі сучасную структуру, але і эфектыўную і разумную арганізацыю сістэмы кіравання. Самаарганізацыя работы спецыялістаў на ўсіх узроўнях адпавядае патрабаванням структуры бяспекі найвышэйшага класа, адзначыў спадар Броннікаў. Нагадаю, што па ўзроўні бяспекі выбраны намі праект мае катэгорыю «тры плюс», дзе прысутнічае актыўны і пасіўны прынцып дзеяння. Пасіўны прынцып дзеяння бяспекі ўвогуле не залежыць ад чалавечага фактару. Падлічана, што стварэнне менавіта такой сістэмы бяспекі «забірае» больш за палову сабекошту ўсёй станцыі.

Галоўны інжынер БелАЭС Анатоль Бондар.

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ЭНЕРГЕТЫЧНУЮ БУДУЧЫНЮ

Уладзімір Броннікаў лічыць, што атамны энергаблок ствараецца, па сутнасці, на сто гадоў. Згодна з праектам, блок паспяхова дзейнічае 50 гадоў. Потым яго тэрмін доўжыцца яшчэ мінімум на 20-30 гадоў. Далей узнікае не менш складаная задача па ліквідацыі гэтага блока з улікам давядзення яго да радыяцыйна бяспечнага стану. Зразумела, што беларускі бок павінен увесь гэты цыкл прадугледзець з улікам практычнага аналізу айчынных навукоўцаў, лічыць Уладзімір Броннікаў. Для ўсяго гэтага неабходна будзе больш актыўна развіваць у нашай краіне навукова тэхнічную інфраструктуру, якая звязана з атамнай энергетыкай.

Так, рынак працы сёння ў свеце даволі адкрыты. Персанал любога ўзроўню кваліфікацыі магчыма цяпер запрасіць і з-за мяжы, аднак... На думку Уладзіміра Броннікава, нашай краіне трэба абавязкова мець сваю ўласную сістэму падрыхтоўкі вузкіх спецыялістаў, а галоўнае — мець структуру атэстацыі кваліфікацыі падобнага персаналу. Такая сістэма абавязкова павінна мець самастойны дзяржаўны статус, каб фукцыянаванне энергетыкі ў нашай краіне не залежала ад знешніх фактараў.

ПАДРЫХТОЎКА І СТАЖЫРОЎКА СПЕЦЫЯЛІСТАЎ — НА ПРАЦЯГУ 2,5 ГОДА

Будаўніцтва вучэбна-трэніровачнага цэнтра для падрыхтоўкі персаналу на БелАЭС плануецца пачаць сёлета ў маі, паведаміў нам **галоўны інжынер прадпрыемства «Беларуская АЭС» Анатоль БОНДАР.** Узвядзенне карпусоў цэнтра плануецца завяршыць у лістападзе 2015 года, а ў 2016-м — пачаць навучанне спецыялістаў. Прагназуецца, што ў наступным годзе на атамную станцыю паступяць у тым ліку трэнажоры для аператыўнага і рамонтнага персаналу, а таксама абсталяванне па лініі мясцовага кіравання.

Прадстаўнік расійскай кампаніі «Атамтэхэнерга» Мікалай ШАСТАКОЎ адзначыў той факт, што галоўнай каштоўнасцю атамнай станцыі з'яўляецца персанал. Менавіта ад таго, як ён падрыхтаваны, залежыць эфектыўная і бяспечная праца аб'екта. На яго думку, набіраць і рыхтаваць спецыялістаў трэба загадзя, для чаго патрабуецца стварыць сістэму навучання кадраў. Яна павінна ўключаць матэрыяльна-тэхнічную базу, вучэбна-метадычны матэрыял і інструктараў. «Арганізацыяй работ па гэтым кірунку на БелАЭС займаюцца спецыялісты, якія маюць каласальны вопыт на дзеючых і будучых атамных станцыях у Расіі, ва Украіне і ў далёкім замежжы», — канстатаваў эксперт. — «Ёсць упэўненасць, што беларускі бок з гонарам справіцца з гэтай самай складанай задачай», — дадаў Мікалай Шастакоў.

Нашай краіне трэба абавязкова мець сваю ўласную сістэму падрыхтоўкі вузкіх спецыялістаў, а галоўнае — мець структуру атэстацыі кваліфікацыі падобнага персаналу.

Анатоль Бондар упэўнены, што за 2,5 года да пуску блока ў эксплуатацыю ў цэнтры персанал будзе кваліфікавана падрыхтаваны і пройдзе адпаведную стажыроўку на блоках дзеючых АЭС за мяжой.

Нагадаю, што цяпер на будаўніцтве айчыннай атамнай станцыі задзейнічана каля 2 тысяч чалавек, а да канца года колькасць будаўнікоў мяркуецца павялічыць да 3,4 тысячы. Агульны аб'ём работ на аб'екце сёлета ў параўнанні з 2013 годам будзе павялічаны ў шэсць разоў. Тэрміны рэалізацыі праекта адлюстраваны ў генеральным кантракце, які прадугледжвае ўвод у прамысловую эксплуатацыю першага блока атамнай станцыі ў лістападзе 2018 года.

ЛІЦЭНЗІЯ НА ПЕРШЫ ЭНЕРГАБЛОК

БелАЭС ужо атрымала поўную ліцэнзію на першы энергаблок. Пад поўнай маецца на ўвазе ліцэнзія на ўвесь аб'ём работ да пачатку эксплуатацыі атамнай станцыі. Разам з тым, спадар Бондар дадаў, што пытанняў да праектнай дакументацыі ў экспертаў Інстытута ядзернай энергетыкі «Сосны» было дастаткова. «Эксплуатуючая арганізацыя і наш генеральны праекціроўшчык правялі эфектыўную працу па іх зняцці», — падкрэсліў Анатоль Бондар.

Сяргей КУРКАЧ.

Мінск-Астравец-Мінск.

ФІЗІКА І ХІМІЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Беларусі летась пасля здачы ЦТ па фізіцы за бортам аказаліся 37% яго ўдзельнікаў, якія не пераадолелі мінімальны парог. Фізіка аказалася для абітурыентаў «каменем», які яны так і не змаглі падняць. З хіміяй не справілася значна меншая колькасць прэтэндэнтаў на вышэйшую адукацыю (8% ад агульнай колькасці). Трэба нагадаць, што ў савецкай школе ўсе выпускнікі здавалі хімію і фізіку ў абавязковым парадку. Мы вырашылі пацікавіцца — ці можна прымусіць школьнікаў паважаць гэтыя дысцыпліны ўвядзеннем абавязковага экзамену, у нашых экспертаў.

Яўген ЛІВЯНТ, рэпетытар па фізіцы і матэматыцы:

— Прапанова проста феерычная. Па логіцы спраў, рэпетытары павінны ўспрыняць яе на «ўра». Школьнікі фізіку не ведаюць, а здаваць экзамен трэба. І куды яны ўсе пойдуць? Правільна, да рэпетытараў. Мне здаецца, што ў Расіі блытаюць розныя паняцці. Сапраўды, з аднаго боку, даводзіцца канстатаваць нізкі ўзровень падрыхтоўкі школьнікаў па дакладных навуках. І гэта праблема агульная для нашых абедзвюх краін. Але незразумела, як могуць палепшыць якасць ведаў дадатковыя абавязковыя іспыты? Мне здаецца, што да вырашэння праблемы падыходзяць зусім не з таго боку...

Фізікай дзіця трэба зацікавіць. А ў нас яна стала выключна тэарэтычным прадметам, ператварылася ў латынь (мёртвую дысцыпліну). Фізіка, як і латынь, якой ужо даўно не карыстаюцца, вывучаецца ў школах выключна па падручніку. Якасць падручнікаў — гэта асобная тэма: змест падручнікаў і даступнасць выкладання матэрыялу не вытрымліваюць ніякай крытыкі. Для таго, каб завалодаць увагай дзяцей, патрэбна сучаснае абсталяванне, дэманстрацыйныя эксперыменты, і, галоўнае, каб настаўнікі ўмелі працаваць з гэтым абсталяваннем. А вырашаць на ўроках бясконца бессэнсоўныя задачы — сапраўдныя пакуты для школьнікаў.

Другая абавязковая ўмова паляпшэння якасці ведаў па фізіцы — гэта высокая кваліфікацыя школьных настаўнікаў. А хто сёння паступае на педагагічныя спецыяльнасці? Самыя нізкія прахадныя балы — менавіта ў будучых педагогаў. Але і пры адсутнасці конкурсу ахвотных ісці на «фізіку» і «матэматыку» можна пералічыць па пальцах. Сітуацыя з педагагічнымі кадрамі ў нашай краіне ўжо катастрафічная, праз колькі гадоў вучыць дзяцей будзе няма каму.

Адзнакі зусім не даюць рэальнай карціны таго, наколькі той ці іншы школьнік канкурэнтаздольны сярод сваіх равеснікаў.

І трэцяя праблема — адмена прафільнага навучання ў старэйшых класах. Ва ўсім свеце выкарыстоўваюцца вучэбныя праграмы па фізіцы, прызначаныя для рознага ўзроўню авалодання гэтым прадметам. Пагадзіцеся, што выкладаць аднолькава фізіку для прасунутых школьнікаў і для тых, хто не сябруе з дакладнымі навукамі, глупства. Апошнія могуць фізіку проста зненавідзець, што мы, уласна кажучы, і назіраем. І нават калі вярнуць у школу абавязковы экзамен па фізіцы, то, хутчэй за ўсё, ён ператворыцца ў прафанацыю. Чаму для многіх вынік ЦТ па фізіцы становіцца шокам? Таму што адзнакі зусім не даюць рэальнай карціны таго, наколькі той ці іншы школьнік канкурэнтаздольны сярод сваіх равеснікаў. А ў ролі экзаменатара будзе выступаць усё той жа настаўнік? Каб вырашыць праблему, не трэба падмяняць паняцці. Нельга зрабіць рамонт, калі ў цябе адсутнічаюць фарбы і пэндзлі... А пакуль у школе будуць практыкавацца цяперашнія падыходы да выкладання фізікі, рэпетытары без работы не застануцца дакладна...

Мікалай ФЯСЬКОЎ, дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў:

— Для тлумачэння многіх з'яў навакольнага свету неабходна разуменне фізічных і хімічных працэсаў, але далёка не ўсе абітурыенты могуць прыгадаць, у якіх адзінках вымяраецца электрычнае напружанне... Як толькі задача ў тэсце абапіраецца на эксперымент, там абавязкова будуць няправільныя адказы. Напэўна, ёсць прадметы (фізіка, хімія, біялогія), якія не могуць выкладацца ў школе толькі на тэарэтычным узроўні, і для авалодання імі ў поўнай меры патрабуюцца практычныя навыкі, правядзенне школьных эксперыментаў і лабараторных доследаў. На гэтую праблему звяртаюць увагу і выкладчыкі, якія рыхтуюць школьнікаў да ўдзелу ў міжнародных школьных алімпіядах. А ў нас абітурыенты не могуць пазнаць прыбор, прызначаны для вымярэння хуткасці, не ведаюць, што такое барометр і што такое мензурка.

Што ж тычыцца прапановы Валянціны Матвіенкі, то я лічу, што экзамен — важны матыватар, прычым як для дарослых, так і для падлеткаў. Ён запатрабаваў бы станоўчых змен у складзе педагагічных калектываў. Вырас бы прэстыж вучэбных прадметаў, павысіўся аўтарытэт настаўнікаў, палепшыўся б і якасны склад абітурыентаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Ёсць погляд, што трэба мець «генетычную схільнасць» да засваення фізікі і хіміі. Дазвольце з ім не пагадзіцца. Як паказваюць асабістыя назіранні, у выдатнага настаўніка і матэматыка, і фізіка — любімыя прадметы ў вучняў, а ў дрэннага дзеці пакутуюць нават на ўроках малявання і фізічнай культуры.

Не падзяляю я і думку, што спачатку трэба стварыць спрыяльныя ўмовы для вывучэння хіміі і фізікі, а потым уводзіць абавязковы выпускны экзамен. Гэта прыкладна тое ж, калі б нашы кінематаграфісты патрабавалі пабудаваць ім здымачныя павільёны не горшыя, чым у Галівудзе, каб здымаць, так бы мовіць, «касавае» кіно. Напэўна, усё наадварот: за цікавым сцэнарыстам, таленавітым акцёрам, творчым рэжысёрам да нас можа прыйсці і той самы «Галівуд».

Пашырэнне пераліку іспытаў на цэнтралізаваным тэсціраванні дазволіла б абітурыенту мець большую манеўранасць пры выбары будучай спецыяльнасці падчас конкурснага адбору ў ВНУ. Пэўны станоўчы вынік мы атрымалі б, калі б на цэнтралізаваным тэсціраванні беларуская і руская мовы мелі статус абавязковых прадметаў. Гэта дазволіла б павысіць не толькі ўзровень моўнай адукацыі, а і прыдаць абедзвюм мовам больш значны статус у адукацыйным працэсе.

Андрэй ІВАНЕЦ, старшыня Савета маладых навукоўцаў Нацыянальнай Акадэміі навук, кандыдат хімічных навук:

— Я хутчэй не падтрымліваю ініцыятыву аб увядзенні абавязковага экзамену па хіміі і фізіцы, таму што калі нешта робіцца з-пад палкі, наўрад ці ад гэтага будзе эфект. Згодны з тым, што ў нас зашмат людзей, занятых у невытворчай сферы: эканамістаў, юрыстаў і гэтак далей. А ў вытворчую сферу маладыя людзі ідуць з меншай ахвотай. Але для таго, каб узняць прэстыж прафесіі, скажам, інжынераў-тэхнолагаў, трэба стварыць адпаведныя ўмовы для іх працы на вытворчасці, каб яны бачылі рэальныя вынікі сваіх намаганняў і каб гэтыя намаганні адэкватна ацэньваліся...

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Прыгожае жыццё

«МІСІС БЕЛАРУСЬ — 2014»: ШОУ ПРАЙШЛО, А ІНТРЫГА ЗАСТАЛАСЯ

Хто з замужніх прыгажунь павязе сваю сям'ю на Мальдзівы?

Увечары панядзелка ля сталічнага Палаца спорту было шматлюдна — падтрымаць удзельніц конкурсу прыгажосці сярод замужніх жанчын «Місіс Беларусь» многія прыходзілі сем'ямі. Але галоўная група падтрымкі збіралася ля службовага ўваходу і складалася з... амаль трох дзясяткаў дзяцей. Пранікнуўшыся важнасцю моманту, будучыя ўдзельнікі дэфіле амаль не капрызілі, нягледзячы на тое, што многім з іх давялося вытрымаць няблізкую дарогу — з Гродна, Гомеля, Магілёва, Наваполацка...

Ахвотніц атрымаць першы афіцыйна прысуджаны тытул «Місіс Беларусь» было шмат — каля 800 беларусак узялі ўдзел у кастынгу. Але толькі 15 з іх прыдзірлівае журы дало «дабро» на ўдзел у конкурсе. Каб апраўдаць гэты давер і пацвердзіць, што кожная з іх варта галоўнай кароны, жанчынам давялося сумяшчаць традыцыйныя сямейныя і гаспадарчыя клопаты з бясконцымі раз'ездамі, трэніроўкамі, дэфіле, працай з фатографамі, стылістамі і візажыстамі, нават выехаць у Літву, каб падабраць і прымераць адмысловыя вячэрнія ўборы... Але ўсе гэтыя высілкі, пагадзіцеся, вартыя галоўнага прыза. «Місіс Беларусь — 2014» атрымае ад тэлеканала АНТ сапраўды каралеўскі прыз — паездку для ўсёй сям'і на Мальдзівы. Для дзвюх віцэ-місіс падрыхтаваны сертыфікаты на значную суму.

Калі ўдзельніцы выкладваліся дзеля конкурсу на ўсе 200 працэнтаў, то гледачы, на наш погляд, крыху падкачалі. У вялізнай зале Палаца спорту мы заўважылі ўсяго чатыры групы падтрымкі, якія падрыхтаваліся і зрабілі плакаты, постары, сцяжкі, склалі крычалкі для сваіх кандыдатак. «Вераніка — ты лепшая!» — рэпеціравалі адны. «Наша Таня — лепш за ўсіх!» — не саступалі другія. А група студэнтаў з Гомеля проста скандзіравала: «Ю-ля, Ю-ля!».

Калі хваляванне дасягнула апагея, з паўгадзіннай затрымкай шоу усё ж пачалося. Дэкарацыі і пралог нібы перанеслі публіку ў шагалаўскі Віцебск. Маленькія дамкі, танцуючыя скрыпачы і паненкі з рознакаляровымі нагамі, сабраная з кавалачкаў карціна «Над горадам» — усё гэта было толькі завязкай першага выхаду ўдзельніц. І дэфіле ў сукенках беларускіх дызайнераў, і танец у сціплых бодзі (як альтэрнатыва традыцыйнаму выхаду ў купальніках) публіцы спадабаліся. Але безумоўным «цвіком» праграмы стала дэфіле з дзецьмі — а іх у канкурсантак 27! Практычна ўся зала не магла стрымаць усмешак, а некаторыя і праслязіліся ад замілавання, гледзячы, як юныя джэнтльмены клапоцяцца пра зусім маленькіх «дам», а тыя з гонарам вядуць за руку самых прыгожых жанчын на свеце — сваіх мам... Выхад Вольгі Жадзеевай з 4 дзецьмі гледачы віталі авацыямі, а ўдзельнікі конкурсу «Містар Беларусь» — нават стоячы. Не стрымлівалі слоў захаплення артысты-мужчыны, якія запаўнялі паўзы паміж дэфіле музычнымі нумарамі. І Герман, і Дзядзя Ваня, і Аляксандр Саладуха, які ўвайшоў у журы конкурсу, прызналіся, што перажываюць за ўсіх удзельніц. Хіба толькі адзін з вядучых, Дзяніс Кур'ян, скарыстаўшыся момантам, шчыра прызнаўся, што ў яго сярод канкурсантак ёсць фаварытка — уласная жонка Юлія.

Свае фаварыткі былі і ў гледачоў, якія сачылі за конкурсам, а таксама ў стылістаў, фатографаў і ў саміх удзельніц конкурсу. Усе гэтыя сімпатыі выліліся ў тытулы «Місіс Фота», «Місіс Элегантнасць», «Місіс Сучасная мама», «Місіс Сяброўства» і «Місіс глядацкіх сімпатый». Журы ж (не ведаем, як ім гэта ўдалося, улічваючы неверагоднае абаянне ўсіх прэтэндэнтак) спыніла выбар усяго на трох удзельніцах. Не называючы імёнаў, дадзім падказкі: адна з фіналістак прадстаўляе адразу два гарады і захапляецца стральбой, другая працуе ў турагенцтве і любіць падарожнічаць, а трэцяя, хоць і мае дачыненне да мадэльнага бізнесу, часта гатуе для блізкіх торты. Менавіта з гэтых жанчын 18 мая гледачы SMS-галасаваннем выберуць першую «Місіс Беларусь», якой і дастанецца паездка на Мальдзівы. Пакуль жа карону ручной работы з жэмчугам і крышталямі Свароўскі прымералі ўсе тры фіналісткі. Бо дзеля прыгожай карцінкі тэлевізійнікам давялося запісаць цырымонію ўзнагароджання тройчы ў розных варыянтах. Так што шоу хоць і адбылося, але інтрыга будзе захоўвацца яшчэ цэлыя тры тыдні.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Даведка «Звязды»

Сёлета ў Беларусі праходзіць не адзін, а адразу тры конкурсы прыгажосці — сярод дзяўчат, мужчын і жанчын, якія ўжо адбыліся як жонкі і маці. Усе тры шоу арганізатар — тэлеканал АНТ — ладзіць на гэтым тыдні, але ў тэлеэфіры першым будзе паказаны Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь — 2014» — 2 мая (у прамой трансляцыі).

Фінал конкурсу «Містар Беларусь» запланаваны для паказу 11 мая, «Місіс Беларусь» мы ўбачым 18-га. І не проста ўбачым — пераможцаў кожнага з гэтых двух шоу менавіта падчас трансляцыі выберуць гледачы, размеркаваўшы свае сімпатыі паміж трыма фіналістамі, якіх вызначыць журы.

Дарэчы

Як расказала кіраўнік дырэкцыі спецпраектаў АНТ Анжэліна Мікульская, у тэлеверсіі «Місіс Беларусь» гледачы ўпершыню ўбачаць і адваротны бок подыуму. Падчас шоу за заслонай было запісана некалькі інтэрв'ю і сюжэтаў, якія дазволяць больш поўна адчуць атмасферу конкурсу.

Сёння ж у Палацы спорту пройдзе фінал конкурсу «Містар Беларусь — 2014», які ўпрыгожыць не толькі сцэнаграфія паводле творчасці Казіміра Малевіча, але таксама выступленне новага складу гурта «ВІА Гра». Самы прыгожы беларус атрымае ў якасці прыза двухтыднёвае сафары ў Афрыцы, а таксама права прадставіць Беларусь на наступным конкурсе «Містар свету».

А суддзі хто?

У журы конкурсу «Місіс Беларусь — 2014» увайшлі:

- мастак Андрэй Смаляк,

- дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосці Алена Троіцкая,

- стыліст Аляксандр Кірынюк,

- тэлевядучы АНТ Тэнгіз Думбадзэ,

- заслужаная артыстка Беларусі Іна Афанасьева,

- дызайнер Лінда Намус,

- чэмпіён Алімпійскіх гульняў у Сочы Антон Кушнір,

- старшыня Міжнароднай федэрацыі фітнесу, майстар спорту СССР па спартыўнай гімнастыцы Наталля Наважылава,

- спявак Аляксандр Саладуха.

■ Вы ведалі?

У БЕЛАРУСІ КАЛЯ 20 ТЫСЯЧ ДОЛАРАВЫХ МІЛЬЯНЕРАЎ

Менавіта столькі чалавек з асабістым капіталам звыш 1 млн долараў пражывае ў нашай краіне па ацэнцы кіраўніка мінскага «А-Клуба» ЗАТ «Альфа-Банк» Аляксея МАЦУКІНА.

Атрымліваецца, што такія людзі складаюць 0,2% насельніцтва краіны. «Гэта практычна супадае з сярэднесусветным паказчыкам. Пры гэтым у Беларусі адсутнічае праблема сацыяльнай няроўнасці, а капіталы багатых людзей краіны нельга назваць астранамічнымі», — лічыць эксперт. Дарэчы, за апошнія два гады колькасць мільянераў у Беларусі выраслa ў 1,5-2 разы. «Гэта быў перыяд упэўненага росту капіталу, пры якім нават кансерватыўныя прылады інвеставання валодалі досыць высокай па сусветных мерках даходнасцю», — растлумачыў кіраўнік «А-Клуба».

Большасць мільянераў пражывае ў Мінску. Як правіла, гэта ўладальнікі бізнесу, бенефіцыяры (людзі, якія атрымліваюць даходы ад сваёй маёмасці), кіраўнічыя партнёры. Наёмныя работнікі сярод мільянераў сустракаюцца вельмі рэдка. Заможныя людзі актыўна карыстаюцца банкаўскімі інструментамі, у першую чаргу дэпазітнымі. Апроч іх, сярод кліентаў мінскага «А-Клуба» Альфа-Банка папулярнасцю карыстаецца паслуга давернага кіравання. Большасць мільянераў з'яўляецца этнічнымі беларусамі. У краіне прадстаўлена нямала прыватных інвестараў з Расіі, Вялікабрытаніі, Іспаніі і Францыі. Сустракаюцца таксама выхадцы з Егіпта, Індыі і іншых краін.

Заможныя людзі ў Беларусі вядуць здаровы лад жыцця і займаюцца актыўнымі відамі спорту. «Большасць з іх людзі спакойныя і нават сціплыя. Яны добра начытаны, цікавяцца гісторыяй і культурай, калекцыянуюць прадметы мастацтва. Некаторыя з іх, як чакаецца, прымуць удзел у аўкцыёне па продажы карцін Нікаса Сафронава, які пройдзе пры падтрымцы «А-Клуба» 5 мая ў Мінску», — паведаміў Аляксей Мацукін.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

Даты Падзеі Людзі

